# Стылі маўлення

## § 7. Маўленчая сітуацыя і яе прыметы. Стылі маўлення (паўтарэнне)

**Успамінаем і паўтараем**

**37.** Дапоўніце схему. Раскажыце, ад чаго залежаць нашы выказванні.

МАЎЛЕНЧАЯ СІТУАЦЫЯ

| | | |
|---|---|---|
| | | |
| • з адным чалавекам;<br>• з многімі людзьмі | • у неафіцыйных абставінах (дома, на вуліцы);<br>• у афіцыйных абставінах (у школе, на сходзе) | • паведаміць пра нешта;<br>• абмяняцца думкамі;<br>• уздзейнічаць на субяседніка |

**38.** Прачытайце тэксты. Ахарактарызуйце маўленчую сітуацыю кожнага з іх (з апорай на схему).

**I.** **Вітамін**

Дзед у садзе сліў натрос,
Поўны кош дамоў прынёс.
— На здароўе еш, Ігнат, —
Вітамінаў у іх шмат.

Сліву ўнук пакаштаваў,
Дзеду костачку падаў:
— Вось, і праўда, вітамін,
Ды шкада — усяго адзін.

*В. Гардзей.*

**II.** Вітаміны — незаменныя пажыўныя мікраэлементы. Яны з'яўляюцца жыццёва важнымі для звычайнай працы арганізма і падтрымання здароўя. Для таго каб атрымліваць розныя вітаміны, неабходна ўжываць розныя харчовыя прадукты: цэльназерневыя і малочныя прадукты, садавіну і гародніну, прадукты групы «рыба — яйкі — птушка — мяса», а таксама харчовыя тлушчы (напрыклад, арэхі, авакада, аліўкі).

**У залежнасці ад маўленчай сітуацыі (з кім гаворым, дзе і з якой мэтай) мы выкарыстоўваем розныя стылі маўлення. Кожны стыль мае свае прыметы: мэта і сфера выкарыстання, моўныя сродкі.**

**39.** Прачытайце і вызначце, якія прыметы характарызуюць гутарковы стыль, а якія — навуковы і мастацкі.

| **Прыметы стылю** | | |
|---|---|---|
| **з якой мэтай выкарыстоўваецца** | **дзе выкарыстоўваецца** | **моўныя сродкі** |
| абмяняцца думкамі, выказаць пачуцці, запытацца пра нешта | падчас гутаркі ў неафіцыйных абставінах | гутарковыя словы і выразы, дыялог |
| вобразна апісаць пэўныя з'явы, прадметы, падзеі | у творах мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці | эпітэты, параўнанні, словы з пераносным значэннем |
| паведаміць навуковыя звесткі, растлумачыць сутнасць якой-небудзь з'явы ці прадмета | у падручніках, слоўніках, даведніках, энцыклапедыях | тэрміны |

Раскажыце, чым адрозніваюцца мастацкі і навуковы, мастацкі і гутарковы стылі.

**40.** Прачытайце выказванні, выбіраючы з дужак патрэбныя літары. Выкарыстоўваючы звесткі з табліцы, абгрунтуйце прыналежнасць тэкстаў да пэўнага стылю.



I. Ажыны падобныя да малін, толькі трошкі буйнейшыя. Па колеры не чырвоныя, а чорныя, з шызым тумановым налётам амаль на кожнай яга*(д/т)*цы.

Прайсці праз ажы*(н/нн)*ік не так проста, бо ён мае *(в/г)*вострыя калючкі. Але ажыны вартыя таго, каб іх збіраць. Ажынавае варэ*(н/нн)*е вельмі духмянае і прыемнае на смак, а свежыя ягады выдатна праганяю*(т/ць)* смагу.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**II.** Ажы́ны — паўкустовая расліна з роду малін. Пладаносіць на двухгадовых парастках, якія за перыяд вегетацыі дасягаюць 4—6 метраў у даўжыню, утвараючы сапраўдныя зараснікі. Найбольш распаўсюджаныя гатункі ажын — «збытная», «тэхас», «чарнаплодная» і інш. Памер ягад — ад сярэдніх да вельмі буйных (10—12 г).

Запішыце тэкст I, раскрываючы дужкі.

**41.** Пазнайце кветку па апісанні. Адгадайце загадку А. Церашковай.

Жоўтае сонейка ў белых пялёстках —
Кожны з нас ведае кветачку простую.
П'ём[ф] з ёй гарбату (праступа міне),
З ёю варожым (кахае ці не).

Сродкі якога стылю выкарыстоўвае аўтар для апісання кветкі? Абгрунтуйце сваю думку.

Якія звесткі можна выкарыстаць для навуковага апісання кветкі? Апішыце кветку ў навуковым стылі. Раскажыце, які выгляд яна мае, дзе і як выкарыстоўваецца.

**42.** Выпішыце з любога падручніка для 6-га класа прыклад тэксту навуковага стылю. Пры неабходнасці запішыце тэкст па-беларуску. Падкрэсліце характэрныя для яго лексічныя сродкі.

## § 8. Афіцыйны стыль маўлення, яго жанры, сфера выкарыстання

**43.** Прачытайце тэкст. Для каго і з якой мэтай ён напісаны?

**Артыкул 2. Дзяржаўныя мовы, іншыя мовы ў Рэспубліцы Беларусь**

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы. Рэспубліка Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця *(Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь»)*.